# ...І ДОЎГІХ АКТЫЎНЫХ ГАДОЎ

## ПРАФЕСІЙНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ, КАМП'ЮТАРНАЯ І ФІНАНСАВАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

Падчас выязнога пасяджэння парламентарыі азнаёміліся з вопытам сумеснай работы тэрытарыяльнага цэнтра і БДПУ імя М. Танка. На базе цэнтра, дарэчы, існуе кафедра ўніверсітэта, студэнты праходзяць тут практыку, працуюць валанцёрамі, а пасля заканчэння ВНУ могуць і ўладкавацца на пастаянную працу. Дэпутатаў цікавіла, чаму маладыя людзі выбіраюць прафесію ў сацыяльнай сферы, якія кампетэнцыі атрымліваюць ва ўніверсітэце, ці супадаюць яны з запытамі пажылых людзей і, нарэшце, ці адпавядаюць патрэбы, якія прад'яўляе рынак працы, з магчымасцямі, што дае адукацыя.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ** канстатавала, што сёння ў Беларусі ўдзельная вага людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэй складае 14,9 %. Як вядома, па класіфікацыі ААН насельніцтва краіны лічыцца старым, калі гэта лічба складае 7 %. Пры гэтым колькасць пажылых грамадзян у Беларусі, як і ва ўсім свеце, расце.

— У сувязі з гэтым далейшае ўстойлівае развіццё магчымае за кошт як пазітыўных змен дэмаграфічнай сітуацыі, так і больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу грамадзян пажылога ўзросту. Гэта вельмі важна, бо прадстаўнікі старэйшых пакаленняў з'яўляюцца носьбітамі ведаў, вопыту, жыццёвай мудрасці — тых асноў, якія неабходныя нам для развіцця краіны і сёння, і ў будучыні. Беражлівае і паважлівае стаўленне да людзей пажылога ўзросту, на мой погляд, — гэта характарыстыка менталітэту беларускага народа, — адзначыла Людміла Кананові.

Парламентарый падкрэсліла, што заканадаўцы мусяць прыняць удзел у вырашэнні такіх пытанняў, як забеспячэнне правоў пажылых грамадзян, стымуляванне больш працяглага працоўнага жыцця, фарміраванне камфортнага ўзроўню іх даходаў, забеспячэнне магчымасці для навучання на працягу ўсяго жыцця, стварэнне ўмоў для здаровага, бяспечнага жыцця і актыўнага даўгалецця, развіццё сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай адаптыўнай інфраструктуры і асяроддзя жыццядзейнасці. Гэтыя задачы і пакладзены ў аснову Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030».

Людміла Кананові нагадала, што прадстаўнікі Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях правялі вялікую работу над гэтым дакументам, у тым ліку сустракаліся з навукоўцамі, прадстаўнікамі дзяржорганаў, абмяркоўвалі спрэчныя моманты.

— Канцэпцыя разлічана на пяцігоддзе, і падчас яе рэалізацыі плануецца стварэнне ўмоў для стымулявання больш працяглага працоўнага жыцця праз увасабленне прынцыпу «адукацыя праз усё жыццё». Гэта дазволіць нам падтрымаць узровень кваліфікацыі работнікаў перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту ў актуальным стане. Канешне, запатрабаваным бачыцца кірунак па камп'ютарнай адукаванасці сярод пажылога насельніцтва для эфектыўнага карыстання электроннымі паслугамі, а таксама павышэнне фінансавай адукаванасці насельніцтва для выпрацоўкі сваёй жыццёвай стратэгіі пасля сыходу на заслужаны адпачынак, — расказала парламентарый.

## ЗАКАНАДАЎСТВА НЕ ЎТРЫМЛІВАЕ НОРМАЎ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ ПА ЎЗРОСЦЕ

Цэлы раздзел Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» скіраваны на пашырэнне магчымасцяў пажылых людзей для ўдзелу ў грамадскім жыцці, занятках фізкультурай і спортам, турызмам і творчасцю, а таксама на развіццё сістэмы медыка-сацыяльнай і герыятрычнай дапамогі, пашырэнне формаў сацыяльнага абслугоўвання непасрэдна па месцы жыхарства пажылых людзей, удасканаленне інфраструктуры і сферы паслуг, якія будуць адаптавацца з улікам патрэб пажылога насельніцтва.

— Важна адзначыць, што наша нацыянальнае заканадаўства не ўтрымлівае нормаў дыскрымінацыі па ўзросце, а, наадварот, усяляк стымулюе інтэграцыю пажылых грамадзян у грамадскае жыццё. Але практыка паказвае, што заканадаўчыя рашэнні не заўсёды працуюць у поўную моц. Таму мы сёння абмяркоўваем гэтыя праблемныя моманты. І наступны наш крок — работа над падрыхтоўкай змен у закон «Аб сацыяльным абслугоўванні». Мяркуецца, што мы прыступім да іх у 2022 годзе. Планаваныя змены датычацца ўдасканалення сістэмы сацыяльнага абслугоўвання, забеспячэння адраснасці сацыяльных паслуг, развіцця сістэмы дагляду, а таксама павышэння эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, што выдзяляюцца на фінансаванне сацыяльнага абслугоўвання і падтрымку грамадзян, якія ажыццяўляюць догляд. Сістэма павінна развівацца так, каб паслугі былі даступныя і запатрабаваныя, рэзюмавала Людміла Кананові.

**Кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска Таццяна КАЛЯДКА** адзначыла, што працягласць жыцця насельніцтва ў той ці іншай краіне — пэўны крытэрый ацэнкі дабрабыту дзяржавы.

— Мы сапраўды сёння падтрымліваем, садзейнічаем і ажыццяўляем комплекс дадатковых мерапрыемстваў для якаснага жыцця нашага насельніцтва, асабліва пажылых і тых, у каго ёсць захворванні і інваліднасць, — падкрэсліла яна.

**Дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска Вольга КАТАВА** пазнаёміла ўдзельнікаў пасяджэння з работай установы. У базах цэнтра больш за 33 тысячы грамадзян, якія сюды звярталіся. У Маскоўскім раёне сталіцы 2882 адзінокія грамадзяне пажылога ўзросту, 5656 пажылых людзей, якія жывуць адны, 432 адзінокія і адзінока пражываючыя інваліды першай групы, 78 ветэранаў ВАВ.

## ПРАФЕСІЙНЫХ КАДРАЎ ПАТРЭБНА БОЛЬШ

Эфектыўная рэалізацыя стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» залежыць ад кадраў, выказала меркаванне **дэкан факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вера МАРТЫНАВА.** Яна расказала, што ўжо тры дзесяцігоддзі БДПУ імя М. Танка першым у краіне вядзе падрыхтоўку спецыялістаў сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай сферы. У цяперашні час гэта такія спецыяльнасці, як «Сацыяльная работа», «Сацыяльная педагогіка», «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога». Выпускнікі ўсіх трох спецыяльнасцяў працуюць у тым ліку і ва ўстановах сацыяльнай абароны насельніцтва. Дэкан падзялілася думкай, што такіх спецыялістаў краіне патрэбна больш:

— На мой погляд, варта пашырыць падрыхтоўку спецыялістаў па сацыяльнай рабоце ў краіне. Мы прааналізавалі сітуацыю: наш факультэт задавальняе ўсяго 17 % заявак, якія паступаюць на нашых выпускнікоў. У прыватнасці, мы выпусцілі дзесяць маладых спецыялістаў па спецыяльнасці «Сацыяльная работа», якія навучаліся на бюджэтнай форме і маюць дзяржаўнае размеркаванне. У краіне 147 ЦСАН, пры тым, што набор 2021 года — 312 чалавек, з іх на бюджэтнай форме навучання — 98 чалавек. Яны будуць мець дзяржаўнае размеркаванне. Гэта невялікія лічбы, каб задаволіць патрэбу тэрытарыяльных цэнтраў у спецыялістах з прафесійнай падрыхтоўкай.

**Намеснік дырэктара Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска Анастасія УРБАНОВІЧ** расказала пра работу цэнтра з пажылымі грамадзянамі, а таксама выказала прапановы зацікаўліваць патэнцыйных апекуноў пажылых і недзеяздольных грамадзян магчымымі льготамі, напрыклад, датэрміновым выхадам на пенсію, матэрыяльнымі выплатамі, дадатковымі днямі да адпачынку.

— Адной з нашых задач было прааналізаваць баланс рынку занятасці і адукацыі, бо ёсць меркаванне, што ўтварыўся разрыў у падрыхтоўцы і кампетэнцыях кадраў з сучаснымі патрэбамі. Мы ўбачылі, што педуніверсітэт рухаецца ў правільным кірунку, удасканальвае дзейнасць у падрыхтоўцы работнікаў для сферы сацыяльнай абароны. У сваёй рабоце яны выкарыстоўваюць новыя тэндэнцыі, такія як сацыяльнае прадпрымальніцтва, што вельмі важна. Паслуга павінна аказвацца таму, хто мае ў ёй патрэбу, мусіць быць запатрабаванай, якаснай і сучаснай. Члены нашай камісіі папрацуюць у сваіх акругах з сацыяльнымі цэнтрамі, і ўсе прапановы, што ў нас збяруцца па ўдасканаленні заканадаўства, мы будзем улічваць падчас работы над зменамі нарматыўных дакументаў, — падвяла вынік Людміла Кананові.

Алена КРАВЕЦ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сусветны банк прагназуе рэкордны рост глабальнай эканомікі

Рост сусветнай эканомікі сёлета складзе 5,6 працэнта, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам за апошнія 80 гадоў. Пра гэта паведаміў Forbes са спасылкай на справаздачу Сусветнага банка. «Чакаецца, што працэс аднаўлення будзе нераўнамерны, таксама існуе значная няпэўнасць адносна трываласці і даўгавечнасці гэтага паказчыка», — адзначаецца ў дакуменце. Хуткі адскок сусветнай эканомікі пасля крызісу шмат у чым абумоўлены інтэнсіўным ростам эканамічнай актыўнасці ў некалькіх буйных краінах. Паводле даных банка, больш за чвэрць глабальнага росту ў бягучым годзе будзе прыпадаць на ЗША і Кітай. Эканоміка КНР вырасце на 8,5 працэнта, што адлюструе задавальненне адкладзенага попыту. На другім месцы — Індыя, чыя эканоміка вырасце на 8,3 працэнта. На трэцім — ЗША, дзе рост эканомікі на 6,8 працэнта будзе абумоўлены дзеяннем буйнамаштабных мер бюджэтна-фінансавай падтрымкі і паслабленнем звязаных з пандэміяй абмежаванняў. «Нягледзячы на абнадзейлівыя прыкметы аднаўлення сусветнай эканомікі, пандэмія працягвае пагаршаць беднасць і няроўнасць сярод насельніцтва краін, якія развіваюцца, па ўсім свеце», — адзначыў прэзідэнт Сусветнага банка Дэвід Малпас.

## Пакістан адмовіўся даваць ЗША свае ваенныя базы

Пакістан адмовіўся даваць свае ваенныя базы ЗША, якія выводзяць войскі з Афганістана і хацелі б у выпадку неабходнасці хутка ажыццяўляць контртэрарыстычныя аперацыі ў гэтай краіне. Пра гэта паведаміла агенцтва Anadolu. «Не можа быць і гаворкі аб даванні ім нашых баз, мы павінны клапаціцца аб сваіх інтарэсах», — заявіў кіраўнік МЗС Пакістана Шах Мехмуд Курэшы. Як вядома, напярэдадні саветнік амерыканскага прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Джэйк Саліван на пытанне журналістаў пра намер Вашынгтона мець базу беспілотнікаў у Пакістане адказаў, што Злучаныя Штаты абмяркоўвалі па ваенных, разведвальных і дыпламатычных каналах пытанне аб тым, каб Афганістан ніколі не станавіўся плацдармам для нападзенняў тэрарыстаў на ЗША.

## Жыхарка Паўднёвай Афрыкі нарадзіла дзесяцёра немаўлят



37-гадовая Гасіямэ Тамара Сітхоле нарадзіла дзесяць дзяцей у бальніцы Прэторыі з дапамогай кесарава сячэння. Характэрна, што падчас медыцынскага сканавання ўрачы выявілі толькі восем эмбрыёнаў. У інтэрв'ю выданню Pretoria News муж парадзіхі Тэбоха Цатэцы расказаў, што Сітхоле нарадзіла на 29-м тыдні цяжарнасці: «Гэта сем хлопчыкаў і тры дзяўчынкі. Я шчаслівы. Я поўны эмоцый». У Сітхоле, якая працуе менеджарам у гандлёвай сетцы, ужо ёсць дзеці — шасцігадовыя блізняты. Жанчына сцвярджае, што зачацце адбылося натуральным шляхам і яна не лячылася ад бясплоддзя. Такім чынам пабіты папярэдні рэкорд, які быў устаноўлены жыхаркай Малі Халіма Сісэ, якая ў маі нарадзіла дзевяць дзяцей у Марока. Да гэтага рэкардсменкай па колькасці дзяцей, якія выжылі, народжаных пры адным нараджэнні, была амерыканка Надзя Сулеман, якая нарадзіла васьмярых у 2009-м.

Імідж і рэпутацыя

# БДУ ЎВАЙШОЎ У 1 % НАЙЛЕПШЫХ ВНУ СВЕТУ

**За ўсю гісторыю ўдзелу ў сусветным рэйтынгу QS гэта найлепшы вынік універсітэта. У апошняй версіі БДУ заняў 295-е месца, падняўшыся ўверх на 22 пазіцыі.**

Нагадаем, што ў 2020 годзе ў БДУ была 317-я пазіцыя, у 2019 годзе — 351-я і ў 2018 годзе — 354-я. З іншых беларускіх ВНУ ў QS прадстаўлены БНТУ ў групе 751—800 і БДУІР — 1001—1200-я пазіцыя. Усяго ў свеце налічваецца каля 30 тысяч ВНУ. Знаходжанне ў першай тысячы з'яўляецца прыкметай прэстыжнасці ўніверсітэта і яго прызнання на міжнароднай адукацыйнай арэне. Пазіцыі ў рэйтынгу маюць вызначальную ролю пры выбары ВНУ замежнымі грамадзянамі, а таксама спрашчаюць працэдуру прызнання дыпломаў за мяжой.

Станоўчая дынаміка БДУ ў QS абумоўлена паляпшэннем рэпутацыі ўніверсітэта сярод экспертаў, а таксама павелічэннем колькасці замежных студэнтаў. Сёлета падрыхтоўку ў БДУ праходзяць каля 4300 замежных грамадзян. У 2020 годзе іх было 3500, у 2019-м — 2500. Сярод усіх ранжыраваных ВНУ, паводле апытання работадаўцаў, БДУ займае 237-е месца (у 2020 годзе — 268-е).

Згодна з новай версіяй рэйтынгу, БДУ паўторна апярэдзіў польскія ўніверсітэты і традыцыйна ВНУ Літвы і Украіны. З расійскіх ВНУ ў рэйтынгу прадстаўлена 48 устаноў. Лідарамі застаюцца МДУ імя М. В. Ламаносава (78-я пазіцыя), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (242-я) і Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт (246-я).

А тройку лідараў QS зноў склалі амерыканскія ВНУ: Масачусецкі тэхналагічны інстытут, універсітэт Оксфарда і Стэнфардскі ўніверсітэт.

Рэйтынг QS разам з Шанхайскім і THE ўваходзіць у «вялікую тройку» самых аўтарытэтных сусветных рэйтынгаў. Гэтыя вядомыя рэйтынгавыя агенцтвы ацэньваюць дзейнасць найлепшых 1000—1500 ВНУ свету. Усяго ў свеце існуе 15 глабальных рэйтынгаў і дзясяткі менш аўтарытэтных, разнастайных тэматычных, прадметных і рэгіянальных. БДУ прысутнічае ў рэйтынгах 12 агенцтваў, у тым ліку ў сямі прадметных рэйтынгах.

Надзея НІКАЛАЕВА.